ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМСАМОЛЬСКАГА І ПРАФСАЮЗНЫХ КАМІТЭТАЎ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ГАЗЕТА УЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1984
5
КРАСАВІКА
ЧАЦВЕР
№ 12 (1425)

Выходзіць раз у тыдзень

Выдаецца з 1922 года.

"Беларускі універсітэт"
тэлетайп
• Учора • Сёння • Заўтра •

## БЮРО КАМІТЭТА КАМСАМОЛА

універсітэта разгледзела работу камсамольскіх арганізацый кафедраў ядзернай фізікі і фізічнай оптыкі фізфака і 2-га патока 4 курса механіка-матэматычнага факультэта па маральна-эстэтычнаму выхаванню камсамольцаў. На пасяджэнні выступілі сакратары камсамольскіх бюро кафедраў І. Кальцоў і М. Іванова, а таксама член камітэта камсамола БДУ Г. Хрол.

Бюро камітэта камсамола адзначыла недастатковую работу кафедры фізічнай оптыкі ў гэтым напрамку. У прынятай пастанове намечаны шэраг мер па сумеснай рабоце з бібліятэкай універсітэта і кафедрай этыкі і эстэтыкі. Бюро адобрыла работу клуба «Верасень» юрыдычнага факультэта па маральнаму і эстэтычнаму выхаванню камсамольцаў.

Ю. ВАРАТНІЦКІ,
кіраўнік прэс-цэнтра камітэта камсамола.

## ПРАЦЯГВАЕЦЦА КОНКУРС

«Сацыялістычнай Балгарыі — 40 гадоў». Умовы конкурсу надрукаваны ў мінулым нумары газеты. Дзесяць пераможцаў будуць узнагароджаны балгарскімі сувенірамі.

В. ШАДУРСКІ.

## НА ПЕРШЫНСТВЕ

Белсавета ДСТ «Буравеснік» па класічнай барацьбе зборная нашага універсітэта заняла першае месца.

В. РУДЗЯНКОЎ.

## У ГОСЦІ

да спартсменаў БДУ імя У. І. Леніна прыязджалі цяжкаатлеты Кіеўскага дзяржаўнага універсітэта імя Т. Шаўчэнкі. Кіяўляне зрабілі экскурсію па беларускай сталіцы, падрабязна азнаёміліся з работай флагмана вышэйшай школы рэспублікі, правялі сяброўскія сустрэчы з універсітэцкімі спартсменамі.

В. КАВАЛЁЎ,
старшы выкладчык кафедры фізвыхавання і спорту.

## НА ПАСЯДЖЭННІ САВЕТА

універсітэта ішла размова аб выкананні рашэнняў дырэктыўных органаў па эканоміі, рацыянальнаму выкарыстанню матэрыяльных, паліўна-энергетычных рэсурсаў і грашовых сродкаў. З дакладам выступіў прарэктар па адміністрацыйна-гаспадарчай рабоце У. І. Сілін. Разгледжаны некаторыя арганізацыйныя пытанні.

З. АЛЯКСАНДРАВА.



## СЛУЖЫЦЬ ЖЫЦЦЁМ РАДЗІМЕ

Аляксандр Дземяшкевіч і Анатоль Смірноў, студэнты юрыдычнага факультэта, узнагароджаны за выкананне інтэрнацыянальнага абавязку ордэнамі Чырвонай Зоркі. Пра іх наш сённяшні расказ.

(Пачатак. Заканчэнне на 2-й і 3-й стар.).

## УСЕ — НА СУБОТНІК!

СТУДЭНТЫ, выкладчыкі і супрацоўнікі універсітэта аднадушна падтрымалі ініцыятыву масквічоў па правядзенню камуністычнага суботніка, прысвечанага 114-й гадавіне з дня нараджэння У. І. Леніна.

Загадам рэктара створаны універсітэцкі штаб па правядзенню «чырвонай суботы». На яго пасяджэнні ішла размова аб тым, як правесці свята працы з максімальнай аддачай, эфектыўна і якасна, як паўней выкарыстаць магутны працоўны патэнцыял універсітэта. Згодна з прынятым рашэннем штаба кожны дзень красавіка студэнты па складзенаму графіку працуюць на ўборцы тэрыторыі Маскоўскага раёна г. Мінска.

У дзень ленінскага камуністычнага суботніка, 21 красавіка, студэнты зоймуцца добраўпарадкаваннем універсітэцкага гарадка, а выкладчыкі і супрацоўнікі будуць працаваць на сваіх рабочых месцах.

## САРДЭЧНА ВІНШУЕМ!

Паспяхова абаранілі ў гэтым годзе кандыдацкія дысертацыі супрацоўнікі і аспіранты універсітэта:

ГЕРМЯНЧУК Віктар Васільевіч — кафедра гісторыі КПСС прыродазнаўчых факультэтаў, навуковы кіраўнік прафесар Т. І. ПРЫТЫЦКАЯ;

ЧАРНЯК Жанна Альбертаўна — мехмат, навуковы кіраўнік доктар фізіка-матэматычных навук Р. І. ТЫШКЕВІЧ;

КУНЧАЎ Агнян Іваноў — ФПМ, навуковы кіраўнік, прафесар Ф. М. КІРЫЛАВА;

ЮШЧАНКА Дзмітрый Пятровіч — мехмат, навуковы кіраўнік прафесар М. Д. МАРТЫНЕНКА;

ЦІХАМІРАЎ Віктар Васільевіч — фізфак, навуковы кіраўнік прафесар У. Р. БАРЫШЭЎСКІ;

ФІЛІПЕНКА Сяргей Іванавіч — гістфак, навуковы кіраўнік прафесар Г. М. ТРУХНОЎ;

КІКЛЕВІЧ Аляксандр Канстанцінавіч — філфак, навуковы кіраўнік прафесар А. Я. СУПРУН;

ВІТЧАНКА Аляксандр Мікалаевіч — геафак, навуковы кіраўнік доктар геаграфічных навук А. Н. ПАЛЯВЫ;

ГУРЫН Мікалай Мікалаевіч — геафак, навуковы кіраўнік прафесар І. І. ТРУХАН;

СТРАЛЬЦОЎ Яўген Анатольевіч — НДІ ФХП, навуковы кіраўнік прафесар В. В. СВІРЫДАЎ;

ЛУШЧЫК Леанід Георгіевіч — НДІ ФХП, навуковы кіраўнік прафесар Ф. М. КАПУЦКІ;

СЯРДЗЮК Уладзімір Міхайлавіч — НДІ ПФП, навуковы кіраўнік дацэнт А. П. ХАПАЛЮК;

КУЧЫНСКІ Пётр Васільевіч — НДІ ПФП, навуковы кіраўнік дацэнт В. М. ЛАМАКА;

КУГЕЙКА Міхаіл Міхайлавіч — НДІ ПФП, навуковы кіраўнік Д. А. АШКІНАДЗЕ;

МАЛІНКА Віктар Іванавіч — НДІ ПФП, навуковы кіраўнік прафесар Д. С. УМРЭЙКА;

ПЕТУХОЎ Уладзімір Міхайлавіч — кафедра марксісцка-ленінскай этыкі, эстэтыкі і навуковага атэізму, навуковы кіраўнік дацэнт М. І. КРУКОЎСКІ;

СІМАНКАС ХЕЛЬНІ ХУАН ФРАНСІСКА — юрфак, навуковы кіраўнік прафесар А. А. ГАЛАЎКО.

Жадаем кандыдатам навук далейшых плённых поспехаў у развіцці навуковых даследаванняў.

## ГАЗЕТА ВЫСТУПІЛА

### ШТО ЗРОБЛЕНА?

## МЕРЫ ПРЫНЯТЫ

«Участкам гарадской службовай пошты Мінскага паштамта праведзена праверка фактаў засарціроўкі пісьмовай карэспандэнцыі ў адрас інтэрнатаў БДУ імя У. І. Леніна. Устаноўлена, што факты, выкладзеныя ў артыкуле «Дзе гэта вуліца, дзе гэты дом...» («Беларускі універсітэт» ад 19 студзеня 1984 года), мелі месца. Засарціроўка была дапушчана падменнымі сарціроўшчыкамі ў перыяд вялікай нагрузкі перад святам.

Артыкул абмеркаваны на дні якасці. Кантралюючым работнікам участка дадзена ўказанне штодзённа праводзіць выбарчы кантроль за работай сарціроўшчыкаў».

Т. ЛЕАНОВІЧ,
намеснік начальніка Мінскага паштамта.

## АДКАЗ... НА ПАПЕРЫ

У МАТЭРЫЯЛЕ «Вечныя» студэнты паняволі» («Беларускі універсітэт» ад 10 лістапада 1983 года) крытыкавалася работа вучэбнага сектара камітэта камсамола універсітэта. У сваім адказе («Беларускі універсітэт» ад 15 снежня 1983 года) намеснік сакратара А. Самойлаў абяцаў абнавіць стэнд «Лепшыя студэнты універсітэта» да 10 лютага гэтага года. Але на календары ўжо красавік, а ніякіх перамен не відаць. Адказ тав. Самойлава застаўся адказам на паперы, а не на справе.

● СЁННЯ—ЯКАСНЫЯ ВЕДЫ, ЗАЎТРА—ЭФЕКТЫЎНАЯ ПРАЦА ●

# «ВУЧЫШ ДРУГІХ — ВУЧЫСЯ САМ»

**Ю. І. Юшко — асістэнт кафедры палітэканоміі гуманітарных факультэтаў. Ён — адзін з самых маладых выкладчыкаў універсітэта.**

**— Юрый Іванавіч, калі ў Вас паявілася думка стаць выкладчыкам?**

— Я закончыў аддзяленне палітэканоміі ў мінулым годзе. У час вучобы аб іншай спецыяльнасці не думаў, бо амаль усе, хто заканчвае аддзяленне, працуюць выкладчыкамі ў ВНУ і тэхнікумах.

**— Студэнтам Вы ўяўлялі сваю працу і рыхтаваліся да яе. Ці супалі тыя ўяўленні з рэальным становішчам?**

— Шчыра кажучы, не. Раней уяўляў працу выкладчыка значна лягчэйшай. Думаў, што дастаткова добра ведаць прадмет. Аказалася зусім не так. Самае цяжкае — адносіны з аўдыторыяй. І тут патрэбна ведаць шмат «тонкасцей».

На аддзяленні палітэканоміі мы атрымалі добрую падрыхтоўку. Выкладчыкі, якія працуюць тут, не абмяжоўваюцца чытаннем лекцый. Яны многа займаюцца са студэнтамі індывідуальна. І, як правіла, студэнцкія групы ў палітэканомаў вельмі моцныя. Напрыклад, з былой маёй студэнцкай групы 10 чалавек закончылі універсітэт з адзнакай. Два разы група выходзіла пераможцай у рэспубліканскім сацыялістычным спаборніцтве на лепшую студэнцкую групу.

**— Студэнты лічаць палітэканомію складаным прадметам. А як лічыце Вы?**

— Палітэканомія непасрэдна звязана з нашым жыццём. Калі па якой-небудзь дысцыпліне дастаткова прачытаць падручнік, а потым прайсці неабходную практыку, то тут студэнт павінен ведаць не толькі эканамічныя тэрміны, але і ўмець эканамічна разважаць, ведаць эканоміку краіны, бачыць яе перспектывы. Ды і студэнты прыходзяць ва універсітэт з рознай падрыхтоўкай, многія паступілі адразу пасля школы і не сутыкаліся дагэтуль з эканомікай.

**— Бывае і такое, што студэнты не рыхтуюцца да заняткаў. Што Вы ў такім выпадку робіце?**

— Перш-наперш паказваю сваю «любоў» да прадмета. Папулярна, даступна і цікава тлумачу той ці іншы тэрмін, стараюся зацікавіць студэнтаў. Акрамя таго, трэба разнастаіць формы правядзення заняткаў. Можна семінары праводзіць як апытанне. Але, сам ведаю, гэта хутка надакучвае і становіцца неэфектыўным. Таму на занятках прапаноўваю дыскусійныя пытанні, розныя задачы, кантрольныя работы. А на аддзяленні філасофіі выкарыстоўваем метад «малых груп». Група падзелена на тры часткі: адна адказвае, другая задае пытанні, а трэцяя падводзіць вынікі. Метад даволі эфектыўны, бо кожны студэнт выступае на занятках і рыхтуецца да іх. Але гэтым метадам цяжка карыстацца ў працы з непадрыхтаванымі студэнтамі. Патрэбна пераконваць кожнага ў значнай ролі палітэканоміі ў фарміраванні светапогляду.

**— Юрый Іванавіч, тут, напэўна, многае залежыць ад выкладчыка, ад яго ўзаемаадносін з групай?**

— Калі грунтоўна праводзіш заняткі, то можна спадзявацца на добрыя вынікі. А для гэтага патрэбна рыхтавацца, бо можаш трапіць ў няёмкае становішча. Бывае такое пытанне зададуць, што адразу і не адкажаш.

Стараюся максімальна зразумела выкладаць матэрыял. Заўважыў, што самая малая недакладнасць выклікае блытаніну. Многія, не разабраўшыся ў матэрыяле, не стараюцца ісці далей, і гэтая блытаніна застаецца. Часта патрэбна прыводзіць прыклады з сучаснасці. Яны прымушаюць студэнтаў супастаўляць, аналізаваць, думаць. Важна наладзіць кантакт з групай. Патрэбна быць тактоўным, добразычлівым. Нельга дапускаць, каб студэнта ўвесь час толькі «крытыкавалі». На практычных заўсёды адзначаю тых, хто добра адказвае. Па сабе ведаю: калі адзначаеш рост студэнта, то гэта стымулюе яго. Некаторыя выкладчыкі лічаць, што галоўнае для іх — правесці заняткі, прыняць залік ці экзамен, а астатняе — нічога не значыць. А чаму студэнт не падрыхтаваўся да заняткаў? Што ён за чалавек? Якую ролю адыгрывае ў групе? Мала хто задае такія пытанні. Бывае так, што студэнты на экзамене гавораць адно, а за межамі універсітэта робяць зусім другое. Значыць, мы — выкладчыкі грамадскіх навук — нешта не дагледзелі, упусцілі.

**— Праца маладога выкладчыка носіць двайны характар— выкладчык вучыць студэнта і сам вучыцца.**

— Самападрыхтоўка займае шмат часу. Па-першае, кожны дзень рыхтуюся да заняткаў. Не толькі паўтараю, але шукаю новыя цікавыя факты. Па-другое, навуковая работа. Яна дазваляе павышаць узровень сваёй падрыхтоўкі. У аўторак, напрыклад, на рэспубліканскай навуковай канферэнцыі «Планамернасць — усеагульная форма руху сацыялістычных вытворчых адносін» выступіў з дакладам на тэму «Двайная ацэнка эфектыўнасці сацыялістычнай вытворчасці». Многа літаратуры давялося прагледзець. А па-трэцяе, грамадская работа. Я з'яўляюся членам камітэта камсамола універсітэта — адказным за сектар ГПП і Ленінскага заліку. Даводзіцца сустракацца са студэнтамі ўсіх факультэтаў. Даведваешся, што іх цікавіць, чым яны жывуць. А гэта вельмі важна для выкладчыка.

На нашай кафедры многа ўвагі ўдзяляецца маладым спецыялістам. Так, на мае заняткі прыходзілі загадчык кафедры прафесар С. Я. Янчанка, партгрупорг В. А. Ожэгаў, другія выкладчыкі. Работу заслухоўвалі на пасяджэннях кафедры і метадычнай секцыі. І гэта былі не проста праверкі. Мне давалі шмат добрых парад, і я вельмі ўдзячны маім старэйшым таварышам.

Работа выкладчыка мне падабаецца. Яна не дазваляе стаяць на адным месцы. Што далей? Патрэбна вучыцца, думаю паступаць у аспірантуру. Сапраўды, вучыш другіх — сам вучыся.

**Інтэрв'ю правёў У. АБРАМОВІЧ, наш. кар.**

# СЛУЖЫЦЬ ЖЫЦЦЁМ РАДЗІМЕ

(Пачатак на 1-й стар.)



ЧАС БЫЎ ужо позні, і вахцёрша ледзь пагадзілася прапусціць мяне ў інтэрнат, дзе жыве А. Дземяшкевіч. Даведаўшыся, аб чым пойдзе размова, Аляксандр дапамог распрануцца і прапанаваў крэсла. Сцісла, амаль суха, магчыма, як гэта і патрабуецца ад будучага юрыста, расказаў пра сябе.

Нарадзіўся і вырас Аляксандр у вёсцы Балашы, што ў Вілейскім раёне. Тут жа закончыў сярэднюю школу. У 1981 годзе ён — выпускнік Навапольскага сельскагаспадарчага тэхнікума. Выпускнік з дыпломам, у якім толькі выдатныя адзнакі. У хуткім часе Аляксандр Дземяшкевіч быў прызваны ў рады Савецкай Арміі.

Сёння Аляксандр Дземяшкевіч — член бюро камітэта камсамола факультэта, стараста групы і адказны за вучэбную і навуковую работу. Як бачыце, абавязкаў — хоць адбаўляй. Але былы воін — выдатнік баявой і палітычнай падрыхтоўкі — і тут спраўляецца на выдатна.

— Дысцыплінаванасць і надзейнасць вызначаюць яго сярод студэнтаў, — так вызначыў галоўныя рысы характару Дземяшкевіча намеснік дэкана факультэта М. К. Казлоў. — Калі тое ці іншае заданне мы даручаем старасце 5-й групы, то ўпэўнены: будзе выканана своечасова і добрасумленна.



Хачу адзначыць таксама прынцыповасць, з якой Аляксандр ставіцца да справы: ці то выказаць сваё меркаванне на партыйным сходзе, ці то патрэбна арганізаваць суботнік на курсе, ці проста весці сваю штодзённую «бухгалтэрыю» — улік тых, хто прысутнічае на занятках.

Удзячныя словы ў яго адрас вы пачуеце і ў камітэце камсамола. Добра запомніўся гэты сур'ёзны хлопец адказнай за арганізацыйную работу Марыне Ткачук у час правядзення мітынгу «Я галасую за мір» на факультэце. А хутка Аляксандр сам стаў арганізоўваць мерапрыемствы на курсе: сустрэчы з работнікамі юстыцыі, цікавымі людзьмі, культпаходы... І ў тым, што на факультэце праз тыдзень-два адкрыецца пакой працоўнай славы, ёсць яго заслуга. Праўда, тут давялося не арганізоўваць, а

**[Заканчэнне на 3-й стар.].**

# СЛУЖЫЦЬ ЖЫЦЦЁМ РАДЗІМЕ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й і 2-й стар.).

больш працаваць нажоўкай, рубанкам і малатком. Але хто стане спрачацца, што гэта работа менш патрэбная?

...У гэты сакавіцкі дзень у 604-й, адной з самых вялікіх аўдыторый юрыдычнага факультэта, як кажуць, яблыку не было дзе ўпасці. Студэнты занялі ўсе парты, падаконнікі, уладкаваліся ўздоўж праходаў, за імправізаваным прэзідыумам размясціліся выкладчыкі, супрацоўнікі кафедраў, прадстаўнікі дэканата, а таксама ваенком Маскоўскага раёна г. Мінска. Апошні знаходзіўся тут, каб уручыць ордэн Чырвонай Зоркі студэнту І курса Анатолю Смірнову. Гэту высокую ўзнагароду А. Смірноў атрымаў за мужнасць і гераізм, праяўленыя пры выкананні інтэрнацыянальнага абавязку.

У кароткай прамове пасля ўручэння ўзнагароды Анатоль Смірноў, звяртаючыся да сваіх таварышаў і выкладчыкаў, запэўніў іх, што здолее прыкласці ўсе сілы, каб быць прыкладам для ўсіх студэнтаў у вучобе і дысцыпліне.





В. ДЗМІТРЫЕЎ,
С. ПЛЫТКЕВІЧ (фота).

# КАЛЕКЦЫЯ ЗАХАПЛЕННЯЎ

## ТЫСЯЧА І АДЗІН РЭЦЭПТ ТВАЙГО ВОЛЬНАГА ЧАСУ

**У кожнага чалавека ёсць любімая справа, якой ён аддае свой вольны час. Адны захапляюцца музыкай, другія — падарожжамі, трэція — спортам... Шырокі свет нашых захапленняў. Бывае так, што мы кідаемся ад адной справы да другой. Але з часам да нас прыходзіць захапленне, якое застаецца на ўсё жыццё.**

**Адзін са сваіх нумароў насценная газета біялагічнага факультэта «Vita» прысвяціла захапленням супрацоўнікаў і студэнтаў.**



СТАРШЫ выкладчык А. Ф. Малашэвіч збірае гістарычныя кнігі... Спачатку ён любіў іх чытаць, а з цягам часу сабраў бібліятэчку. **«Калі прагледзець яе, — піша ён,— то можна прайсціся па ўсёй гісторыі нашай Радзімы, якую мне хацелася добра вывучыць. Асабліва многа кніг аб Вялікай Айчыннай вайне, падзеі якой можна прасачыць амаль па днях».**

На факультэце многія любяць падарожнічаць. І гэта не дзіўна, бо выкладанне біялагічных дысцыплін патрабуе выкарыстання многіх выразных сродкаў. Дацэнт Ю. А. Бібікаў разам са сваімі таварышамі адшуквае рэдкія і знікаючыя віды раслін, унікальныя фітацэнозы, ландшафты. Здымае іх на каляровую плёнку. Падарожнічаў ён па лясах і лугах Беларусі, давялося пабываць у пустынях Сярэдняй Азіі, на Алтаі, Цянь-Шані, Каўказе, у Карпатах. А колькі яшчэ планаў!

Дацэнт В. І. Калешка пабывала на Далёкім Усходзе і Усходнім Алтаі, падарожнічала па Волзе, рэках Сібіры.

**— Калі падарожнічаеш па якому-небудзь краю, — гаворыць яна,— то патрэбна ўмець бачыць яго асаблівасці, а ў кожнай мясцовасці ёсць непаўторныя рысы.**

Для многіх захапленне ў дзяцінстве прыродай стала работай.

**— У раннім дзяцінстве ў мяне жылі яшчаркі і чарапаха, а калі хадзіла ў трэці клас, то дома развёўся цэлы пацучыны звярынец,— успамінае дацэнт А. Г. Сташонак.**

**— А я захапляюся кактусамі, — расказвае пяцікурснік А. Ярашэвіч. — Кожнага чалавека не можа не ўразіць разнастайнасць іх форм і колераў. Угледзьцеся ўважліва і вы ўбачыце, што гэтыя «калючкі» — прыгожыя. Звыш трох тысяч відаў — дастаткова для задавальнення ўсіх запатрабаванняў самых заўзятых калекцыянераў.**

Студэнт 3 курса Э. Юрочка— рыбак. Рыбалоўства, як лічыць ён, выхоўвае чулыя адносіны да прыроды, а ў эмацыянальным плане — ні з чым непараўнальна.

Пяцікурсніцу Л. Ерашэнка захапляе мастацтва танца і музыкі. У танцах у дзяцінстве яна дасягнула пэўных поспехаў, і бацькі паралі ёй ісці ў музычную школу. Спачатку яна аднеслася да гэтага абыякава, але з цягам часу палюбіла музыку, пачала сама спяваць і зараз лічыць сябе шчаслівым чалавекам у сваім захапленні.

**— Мае захапленні з гадамі мяняліся, а вершы засталіся,— так гаворыць М. Магілеўская, студэнтка 3 курса. — Любоў да іх мне прывіла мама. Яна вучыла не проста завучваць, а даходзіць да галоўнага: разумець іх сэнс, арыгінальнасць кожнага слова, кожнай фразы.**

Асістэнтка Н. А. Якімовіч любіць вышываць і вязаць. Гэта цудоўны спосаб праявіць сваю фантазію, магчымасць адпачыць, і, самае галоўнае, сам робіш рэчы, якія ўпрыгожваюць цябе і твой дом.

**— Часта заўважаеш толькі тое, з чым непасрэдна сутыкаешся, а потым забываеш яго,— піша чацвёртакурснік І. Бышнеў.— Пры жаданні можна аднавіць убачанае. Для мяне такім спосабам сталі фатаграфія і малюнак. Гэта дазваляе канкрэтызаваць думку, глыбей пазнаць сябе.**

Аб удачах Ігара можна меркаваць і па работах, якія былі надрукаваны на старонках нашай газеты.

**— А мы любім гатаваць ежу, — заяўляюць пяцікурсніцы Т. Вінаградава і Т. Федарэнка.— Дзякуючы гэтаму можна ператварыць кожны абед ці кожную вячэру ў маленькае свята.**

Інжынер В. Цітавец любіць футбол. Аматар сам выходзіць на поле, выступае ў саставе каманды факультэта. Ён не шкадуе, што футбол забірае шмат часу. Спорт дае яму здароўе, бадзёрасць, радасны настрой.

Захапленне студэнта А. Шаца — турызм:

**— Я раней многім займаўся: іграў на гітары, вучыўся плаваць. Але гэта было непастаянным. Калі я пачаў хадзіць у паходы, то зразумеў, што іменна тут ёсць магчымасці для праяўлення сваіх здольнасцей. Турызм — гэта спорт, веданне гісторыі, біялогіі, геаграфіі, медыцыны, псіхалогіі, тапаграфіі...**

Свет нашых захапленняў сапраўды шырокі. І гэта вельмі добра. Калі ў чалавека ёсць хобі, то, бясспрэчна, такі чалавек — цікавы субяседнік. А магчымасці для захапленняў — тысяча і адна... Выбірайце!

**І. УЛАДЗІМІРАЎ.**

# «ЗАБІВАЮЦЬ МІКУ БАКІ»,

## АБО ПРА АПОШНІ ШАНС УВЕКАВЕЧЫЦЦА

ПЕРАНАЧАВАЎШЫ у бедным духане, Астап Бендэр і яго спадарожнік Іпаліт Мацвеевіч бадзёра рушылі далей па Ваенна-Грузінскай дарозе. Памятаеце там, дзе скалы сціснулі пад мастом магутны Церак, Астап першым заўважыў крыху вышэй воблака, але намнога ніжэй арла надпіс: «Коля і Міка, ліпень 1914 г.» Адпаведнае рашэнне выспела ў галаве вялікага камбінатара імгненна:

— Кіса, — рашуча прапанаваў Бендэр, — давай і мы ўвекавечымся. Заб'ем Міку бакі!

Доўга не разважаючы, Астап рушыў угару, каб пакінуць на каўказскіх каменнях чатыры шматзначныя словы: «Кіса і Ося тут былі».

З таго часу, калі дзейнічалі героі Ільфа і Пятрова, мінула ўжо больш за паўстагоддзя. Але аматары «забіць бакі» так і не перавяліся. Іх «аўтографы» крэйдай або фарбай, поўныя пэўнай выразнасці выслоўі можна сустрэць і на лаўцы ў парку, і на дзвярах тралейбуса, і нават на бачках для смецця. Але больш за ўсё жадаючым увекавечыцца падабаецца пакідаць свае «творы» на сталах, крэслах, старонках бібліятэчных кніг, студэнцкіх партах.

Завітаем, напрыклад, на філалагічны факультэт у аўдыторыю № 37. Дастаткова прайсціся ўздоўж сталоў, каб адразу ж зразумець, што тут вучацца «шчырыя» людзі, якія не прывыклі ўтойваць свае думкі. І красуецца кімсьці надрапанае на гады: «Я хачу да мужа». А крыху ніжэй: «Я таксама хачу да твайго мужа».

Думкі «шчырых» людзей могуць прымаць самыя разнастайныя адценні. Вось вам прыклад філасофскіх разважанняў: «Каханне прыходзіць і ўходзіць, а есці хочацца заўсёды». А вось «сяброўская» парада: «Студэнт, не пытайся на лекцыі, каб не разбудзіць побач спячага». «Крытычны» погляд на аднакурсніка: «Цубнецкая — сахляціна».

А зараз я хачу звярнуцца да ўсіх тых, хто марыць аб паэтычнай славе: стройцеся ў калоны і ўсе — марш, марш на філфак у 37-ю аўдыторыю. Толькі тут вы зможаце адчуць сапраўднае натхненне і напісаць свае самыя бессмяротныя радкі. Бо ў 37-й натхняюцца нават тыя, хто ні на рускай, ні на беларускай мовах пісаць не ўмее. Яны складаюць свае творы па-англійску. І шмат ужо нaскладалі. Мясцовая ж «класіка» на сённяшні дзень прадстаўлена наступнымі радкамі:

Найти к любому сердцу ключ
Поможет обувь фирмы «Луч».

Ну і, безумоўна, ахвочыя да настольнай пісаніны людзі — аматары спорту. Але яны балельшчыкі своеасаблівыя, здольныя ў адзін і той жа час апладзіраваць і Уладзіславу Траццяку, і Уэйну Грэцкі, выказваць сваё захапленне Наталляй Бесцям'янавай і абурацца ў адрас Андрэя Букіна. Карацей кажучы — усё комам. І сярод гэтай мешаніны сціпла значыцца: «Кіса і Ося былі тут 18.2.83».

Мяркуючы па колькасці мінуўшых гадоў, ужо ўнукі Астапа Бендэра бяруцца за справу. Чым сконччыў вялікі камбінатар — усім вядома. На што спадзяюцца яго паслядоўнікі?

На непакаранасць. Яны ўпэўнены, што іх ніхто і слова не скажа супраць. І ўжо пагражае выгрызенае сінім на дошцы стала: «Мы заб'ём усіх, хто пойдзе на нас словам».

Застаецца дадаць, што ўзоры ўсіх шрыфтоў, эскізы, малюнкі, разнастайныя почыркі ператварылі ў «выставачныя залы» і 37-ю, і 35-ю, і 27-ю аўдыторыі, сталы, сцены і дзверы 43-й і 41-й аўдыторый. Толькі назвы ў гэтай выстаўкі няма. Прапаную на выбар: «Бескультур'е-84», «Узоры свавольніцтва»...

Апошняе, што хочацца адзначыць: «арганізацыя» такіх «выставак» абыходзіцца ў кругленькую капейку для універсітэта. Толькі на адным філфаку кожны год на падтрыманне ў неабходным выглядзе старой мэблі, пабелку і пафарбоўку аўдыторый траціцца нямала паўнавесных рублёў. А на гэтыя грошы можна было б купляць новае абсталяванне, вучэбныя дапаможнікі, урэшце — новую мэблю.

Як змяніць становішча? Каб адказаць на гэта пытанне, патрэбна абавязкова ліквідаваць галоўную прычыну, якая дазваляе існаваць застарэламу бескультур'ю,— непакаранасць.

Што можа быць прасцей? Злавілі такога «мастака» за руку — няхай плоціць за рамонт са стыпендыі або адпрацуе пэўны час у брыгадзе па рамонту. Гэта будзе эфектыўней за любую вымову. І тут хочацца параіць: чаму б факультэцкай і курсавым камсамольскім арганізацыям не ўзяцца назіраць ці ёсць парадкам у сваіх вучэбных памяшканнях? Думаецца, тады б крывая росту колькасці насценнага і настольнага «жывапісу» рэзка пайшла б уніз.

**В. ЧАРНЯЎСКІ,**
**наш кар.**



# Ружовы ранак

Літаратурная старонка




Аляксандр БЕЛЬСКІ,

студэнт філфака


## ПРАЦОЎНАЯ ВЯСНА

Вясну прывітным голасам
вітае
Птушыны гай, узараная ралля.
За новы хлеб у бітву ўступае
Руплівых рук вялікая сям'я.

Бурліць сяўба да поцемкаў у полі,
Гарачы час дыктуе свой закон.
Не знаюць рукі хлебаробаў стомы,
Працоўны дзень нясе здабыткаў плён.
Вясны дыханне кожны адчувае,
Хвалюе і бадзёрыць зерня пах.
Салёны пот у працы закіпае,
І свеціцца ўсмешка ў вачах.

Узрасцяць людзі шчодрыя ўсходы,
Высокім, добрым будзе ўраджай,
Такі салодкі, сэрцу да спадобы
Радзімы нашай хлебны каравай.
Вясну прывітным голасам вітае,
Птушыны гай, узараная ралля...
Сардэчна хлебам-соллю сустракае
Гасцей сваіх Капыльшчыны зямля!


Татьяна АЛЕШКА,

студентка филфака


*Листья — веселый*
*табор цыганский*
*Кочует по осени*
*в днях-кибитках,*
*Певучий,*
*кружащийся,*
*пестрый,*
*шумный,*
*В платках разноцветных*
*И латаных свитках.*
*С ветром пускается*
*в пляски отчаянно,*
*Жжет костры*
*по лесам*
*и садам.*
*Но как-нибудь*
*утром*
*Заметим нечаянно,*
*Что табор ушел*
*по лета следам.*


Ганна ВЯЗІЦКАЯ,

студэнтка філфака


## ЛІХТАРЫ

Туман разаслаўся па гораду
Лёгкай халоднай дымкаю,
Светлаю газавай хусткаю
Хіліцца да ліхтароў.
А тыя, такія гордыя,
Святлом праз цемру дыхаюць,
Нібы сагрэць спрабуючы
Шэрыя сцены дамоў.
Святло іх сплывае, мроіцца,
Рэдкі паўзмрок адганяючы.
Лёгка цяпло губляецца
У воблаку ціхай імглы.
Іх называюць роднымі,
Фары машын абганяючы,
Дзіўныя, недаступныя,
Чароўныя ліхтары.


Валянціна МІСЮК,

студэнтка філфака


## ПЕРШЫ КРОК

*Чалавек на зямлі*
*Робіць першы свой крок.*
*Асцярожна!*
*Каб ён не ўпаў незнарок,*
*Падтрымайце яго,*
*Вельмі цяжка ступаць,*
*І здаецца такою вялікай*
*зямля.*

*Зберажыце яго!*
*Працягніце далоні,*
*Каб цяпло вашых рук*
*Назаўсёды запомніў*
*Чалавек,*
*Што ў жыцці*
*Робіць першы свой крок.*




Тамара МИХАЛЬЧУК,

аспирантка кафедры русского языка


## СТИХИ О ДЕТСТВЕ

Тут каждый кирпичик,
пропитанный детством,
Как самое ценное в жизни
наследство,
Хранит наши лучшие в мире
считалки
И светлые кольца
циркачки-скакалки.
Хранит нашу радость
и горькие слезы,
Палитру цветных синяков
и занозы,
Тут детство оставит
на все времена
Несмелый автограф —
крючки-имена.

Да здравствует бессонница
читален,
Экзамена победного итог!

***

Синей шторою вечер
Затянул небосвод.
Звезды вспыхнули свечкой,
Спит курносый народ.
И луна сонно светит,
Словно лампа-ночник.
Ровно дышится детям,
Безмятежен их лик.
Спят солдатиком — прямо —
И уютным крючком.
Хорошо, что есть мама
И заботливый дом.
Хорошо, что есть папа,
И бабулька, и дед,
И медведь косолапый,
И молочный рассвет.
Им бы звездочки-брошки,
Да фонарик луны,
Да скорей встать на ножки,
Но не надо — войны!

## СТУДЕНТЫ

Студенческий улыбчивый
народ,
Всегда неунывающая братия.
Поутру перехвачен
бутерброд,—
Зачеты, курсовые и занятия...

Манят его дороги необычные,
Ему решать проблемы
и загадки...
Да здравствуют очкарики-
отличники,
Соленый пот трудяг-
стипендиатов!
А ночью, когда улицы тихи,—
Так было и так будет
на планете —
Студенты пишут нежные стихи
Своим, одним единственным
на свете.
Конспектов Джомолунгмой
стол завален,
И сессий неизменных холодок.




Сергей МЕЛЬНИКОВ,

студент истфака


## МАЛЬЧИШКИ

Мальчишки с моего двора
Играют, увлеченные, в футбол,
Не замечая, что забитый ловко
гол
Летит мне в душу радостным
«ура!»

Их лица в отсветах улыбок и
добра,
И вспышки гнева, явно
невсерьез.
Мелькают шапки легкие волос,
Роняя капли пота-серебра.

Есть совершенство в чуде
естества:
Для них не существует слов
укор,
В них спорно все и все
наперекор,
А рядом распускается весна.

Но это только повод, суть —
игра,
И бьется мячик пульсом
бытия,
Как спутник, тренажеры все
пройдя,
Он рвется в космос с моего
двора.


Сяргей ЧЫГРЫН,

студэнт філфака


## ЛЯ СЫНКОВІЦКАЙ ЦАРКВЫ

Я слаўлю тваю
старажытнасць
На слаўнай славянскай
зямлі,
Дзе ў сонцы купаецца жыта
І ў вёсках рыпяць жураўлі.
Дзе мова гучыць беларуская,
Ад кветак святлеюць бары,
Дзе кожная сцежка вузкая
Расою блішчыць на зары.
Дзе звычай жыве
спрадвечны —
Вяселлі спраўляць гучней...
Дзе ты так падобна
на вечнасць
Сярод землякоў і гасцей!



Малюнкі Ігара БЫШНЕВА, студэнта біяфака.


Вадзім ГРАМОВІЧ,

студэнт журфака


# ЗМАН

## АПАВЯДАННЕ

БАЧЫЦЕ таго даўгалыгага хлопца, што энергічна выштукоўвае нагамі? Так, той, у джынсах і скуранай куртцы. Гэта Барыс Альховіч. Барыска, як завуць яго ў групе. А Зінку, Зіну Васькевіч, адсюль не відаць. Яна сядзіць там, у куце. Між Зінкай і Барыскам нібы чорная кошка праімчала. Як раптоўна сышліся, так і разышліся ў розныя бакі.

Альховіч, згодзен, хлопец відны з сябе. Апранаецца па апошняй модзе, прычоска — хоць на партрэт для рэкламы ў цырульню. Прыгожы, адным словам. Толькі халодная, нежывая ў ім прыгажосць. Быццам манекен у вітрыне магазіна. Хаця і гэтае параўнанне — вялікі гонар для Барыскі. Звычайны эгаіст, які апроч сябе нікога ў гэтым свеце не любіць.

Чаго я так уз'еўся на хлопца? Скажаце, ад чорнай зайздрасці? Як-ніяк увесь курс у яго ў сябрах ходзіць, а пра дзяўчат ужо і казаць не варта. Некалі я таксама Барысу ў рот заглядваў, першым смяяўся на яго жарты. Паважаў. Думаў — вось асоба, сапраўдны мужык, свой...

Але гэта было раней...

Зінку я ведаў дрэнна. Сустракаў разоў некалькі ў інтэрнаце на дыскатэцы. Яна на іншым факультэце вучыцца, жыве на дзевятым паверсе. Я ж — на пятым, па суседству з Барыскам.

Сволач ён, гэты Барыска. Ды і аб Зінцы я думаю зараз не лепш. Проста ўзненавідзеў дзяўчыну. Усё з-за таго выпадку...

Вось усе танцуюць, весяляцца. Вядома, такое свята — 8 Сакавіка! А ён, хлопец той, яшчэ дзве вясны мусіць сустрэць там... У месцах, не дужа аддаленых, як кажуць.

Вунь, глядзіце, Зінка з залы пабегла. Вочы на мокрым месцы. Нашы дзяўчаты праводзілі яе здзіўленымі позіркамі. Маўляў, чаго яна? Барыска — паказальна спакойны. Нібы ўсё тое яго не датычала. Але ж гэта не так! Не так!

Я ведаю, што падслухоўваць нядобра. Дзякуй настаўнікам, давялі ў школе. Але ж у нашай аўдыторыі ўвесь час не шчыльна прычыняліся дзверы. Калі ішоў сёння ў гардэроб, пачуў, як у 103-й нехта гучна ўсхліпвае. Хацеў зазірнуць, але спыніў мяне ад гэтага намеру добра знаёмы голас. Гаварыў Альховіч:

— Змоўкні нарэшце, Зінка! Ты што, сапраўды думала, што я цябе за муж вазьму? Ну-ну, знайшла дурня. Што, што абяцаў? Абяцанкі-цацанкі... Ты ж сама ведаеш, чаму... Каб не трапіць туды, дзе зараз твой святы заступнік загарае. Дон-Кіхот знайшоўся. За тое, што казала на следстве, на судзе — вялікае дзякуй, а пра ўсё астатняе забудзь...

Ён казаў яшчэ нешта. Ды я ўжо не чуў. Хутка пакрочыў у гардэроб. Было такое адчуванне, нібы ўлез у нейкі бруд, запэцкаўся з ног па самыя вушы.

Відаць, праўду казаў Гуз — правая рука Барыскі. Зманілі на судзе сведкі. І Зінка зманіла. Наабяцаў ёй Альховіч, што адразу пасля суда панясуць заяву на шлюб. А тая небарака і паверыла. Каму? Барыску?!

А з-за яе хлопец мога ўласным жыццём рызыкаваў. Не пабаяўся ўстаць між дзяўчынай і чатырма бамбізамі, якія былі на добрым падпітку. Дужа хутка яна забыла на іх п'яныя заляцанні, на тое, што сама скрозь слёзы закрычала, убачыўшы выпадковага прахожага: «Дапамажыце!».

Ён дапамог. Магчыма, апошні раз у жыцці. Наўрад ці зробіць больш крок, каб працягнуць руку чалавеку, які трапіў у бяду. Пасля такога зману. Тут кожны б страціў веру ў людзей. Калі вось так плюнуць у душу, растопчуць усё святое.

Я не ведаў таго хлопца. І наўрад ці пазнаёмлюся з ім. Ды што гэта зменіць? Суд ужо адбыўся. Прысуд прагучаў сурова: «Тры гады зняволення...».

Пра сваю патрушчаную скіўцу Барыска ўжо паспеў забыцца. Зажыло, як на сабацы. Яго сабутыльнікі таксама пазагойвалі сінякі. Нават у Васіля Гуза зажыла рана на галаве. Калі б не тая цагліна, што трапілася хлопцу пад руку, усё магло быць інакш.

А пасля вялося следства. І выходзіць, што праз усе сустрэчы з маладым лейтэнантам міліцыі ў кабінеце следчага Зінка маніла. Што з Барыскам у іх даўнія адносіны. Што неўзабаве яны пабяруцца. Што ў той вечар проста блазнавалі. Што абвінавачаны не зразумеў гэтага. І на дапамогу ніхто нікога не клікаў...

Урэшце так ёй, Зінцы, і трэба. Будзе ведаць, што сумленне на дробязі не разменьваецца, што свайго шчасця на чужой бядзе не пабудаваць.

А Барыска? Яму хоць бы што. Вунь танцуе сабе. Прыгожа танцуе. І ўсміхаецца сваёй партнёршы так, нібы ён тут, на вечары, імяніннік. А мяне аж падмывае падысці і ўрэзаць па гэтай усмешцы, па гэтых тонкіх, прыгожых вуснах. Ад усяе сілы. Няхай не зразумее, за што, але ён таго варты. Я рашуча прабіраюся праз натоўп...


БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

5 красавіка 1984 г.

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ.

АТ 10157. Зак. 581.

220080, МІНСК-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ГЕАГРАФІЧНЫ КОРПУС, п. 3.

ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар

В. П. ВАРАБ'ЁЎ